ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту.

Асобны №: каштуя усюды 35 кап.

№ 30

ГАЗЭТА КАШТУЯ:

	На 12 мес.	На 9 мес.	На 6 мес.	На 4 мес.	На 3 мес.	На 2 мес.	На 1 мес.
У Расеі	15р.—к.	11р.50к.	8р.—к.	5р.20к.	3р.90к.	2р.60к	1р.30к.
За граніцу	20р.—к.	18р.—к.	12р.—к.	8р.70к.	6р.—к.	4р.—к.	3р.—к.

Калі выпісваяцца разам некулькі №№, та робіцца уступка на 20%.

Перамена адрысу каштуя 50 кап.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52.

Масква, 1918 г. 17 Сенцябра. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. І-й год выданьня.

Канцылярыя Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

Да ведама беларусау бежанцау.

Бежанскі атдзел Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту мая сваіх прадстаунікау (эмісарау) вось у якік мейстох: у г. Воршы (Слободская ул., д. Лібстера), т. А. К. Дубіцкі, у г. Тамбовя (Гімназічаская ул. гасц. Буракова) т. В. А. Бобко, у г. Саратаве (гасцініца „Асторія", кв. 78) т. А. Е. Степанюк, на пагранічнум пункту, ст. Палата т. С. Падберэзкі. Па усім справам, датычным бежанцау, прозьба на местох звертацца да гэтых людзей па упомняных адрысох.

Бежанскі атдзел Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту.

Ад Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту.

Беларускім Нацыянальным Камісарыятам адчыняны атдзелы Камісарыяту: у г. Вітабску (Суворауская, д. 48), у г. Смаленску (Б. Казанская, 14) і у Петраградзя (Тэатральная, 3). Па справам беларускім радзіцца усім зварочвацца па гэтым адрасом. Там жа прадаюцца беларускія кніжкі і газэта „Дзянніца".

Б. Н. К.

ПРИКАЗ
Центральной Коллегіи о плѣнных и бѣженцах.
30 августа 1918 года.
№ 109.

В силу дѣйствующих не отмѣненных законоположеній (кн. VII СВП. 1896 г), командировки лиц, состоящих на службѣ, допускаются лишь для дѣйствительных служебных надобностей и для исполненія служебных порученій.

Для частных надобностей командировки по закону воспрещаются. Учрежденія, имѣющія право отправлять служащих в командировки, посылают их только в самых крайних случаях, при этом, при всѣх командировках наблюдается, чтобы командируемыя лица, были направляемы прямо в тѣ мѣста, куда командировка назначена.

Посему признается необходимым установить впредь к неуклонному исполненію, чтобы лица, пріѣзжающія по дѣлам Коллегіи о плѣнных и бѣженцах получали каждый раз командировку от соотвѣтствующей мѣстной коллегіи, причем командировки должны быть ограничены до минимума и допускаемы лишь в самых экстренных случаях.

Предсѣдатель Центральной Коллегіи **І. Уншлихт.**

С подлинным вѣрно: за секретаря (подпись)

ПРИКАЗ
Центральной Коллегіи о плѣнных и бѣженцах.
29 августа 1918 г.
№ 108.

Всѣм Коллегіям о плѣнных и бѣженцах, всѣм Губсовдепам.

Согласно международных договоров, подтвержденных послѣдними постановленіями, военноплѣнные офицеры не подлежат обязательному привлеченію к труду.

В случаѣ же добровольно выражаемаго желанія, военноплѣнным офицерам может быть поручена соотвѣтствующая работа за исключеніем выполненія обязанностей административнаго характера и под непремѣнным условіем полученія в каждом отдѣльном случаѣ разрѣшенія Центроплѣнбѣжа в установленном порядкѣ.

Обо всѣх военноплѣнных офицерах, состоящих нынѣ гдѣ-либо на службѣ, в учрежденіях и заведеніях, или выполняющих работу у частных лиц, согласно разрѣшеній, выданных прежними правительственными организаціями, подробныя свѣдѣнія, с указаніем условій привлеченія к труду, должны быть незамедлительно сообщены Центроплѣнбѣжу.

Во всѣх вновь возникающих случаях заинтересованным лицам и учрежденіям предлагается обращаться за разрѣшеніем непосредственно к Центроплѣнбѣжу.

Военноплѣнные офицеры, выполняющіе, согласно приведеннаго выше порядка, работу в правительственных [...] вѣтских, земских и городских учрежденіях, а также состоящіе на службѣ в частных предпріятіях, сверх содержанія, получаемаго ими по роду исполняемых обязанностей, не должны удовлетворяться спеціальным жалованьем от военнаго вѣдомства, и причитающимся им как военноплѣнным офицерам.

Подлежащим мѣстным властям предписывается прекратить выписку содержанія на военноплѣнных офицеров, находящихся на службѣ в указаннаго рода учрежденіях.

Освободившіеся денежные отпуски держать на особом учетѣ и данныя о них сообщать Центроплѣнбѣжу при представленіи смѣт.

Предсѣдатель Коллегіи **І. Уншлихт.**

С подлинным вѣрно: за секретаря (подпись)

ПРИКАЗ.
№ 104.
24-го августа, 1918 г.

В виду сформированія по заданію Центральной Коллегіи о плѣнных и бѣженцах Московскаго Эвакуаціоннаго Пункта, предписывается Московской Коллегіи о плѣнных и бѣженцах передать названному пункту нижеслѣдующія дѣлопроизводства Коллегіи:

1) Дѣла о сан-поѣздах, приписанных к Московскому пункту.

2) Дѣла распредѣлителей и приписанных к ним лечебных заведеній города Москвы и губерніи.

3) Дѣла, касающіяся снабженія госпиталей и сан-поѣздов, впредь до передачи снабженія в мѣстное интендантство, остаются в Московской Коллегіи.

Передачу совершить по законным актам, кои представить в Центральную Коллегію о плѣнных и бѣженцах.

Московской Коллегіи о плѣнных и бѣженцах вмѣняется в обязанность производить посадку здоровых вражеских и пріем здоровых руских военноплѣнных, а также имѣть контроль и наблюденіе за правильным содержаніем и удовлетвореніем военноплѣнных и бѣженцев.

ПРИКАЗ.
№ 105.
24-го августа 1918 г.

В дополненіе Приказов Центральной Коллегіи о плѣнных и бѣженцах №№ 48, 64 и 91.

1) Из числа бѣженцев, освидѣтельствованных в порядкѣ, указанном в приказах 48, 64 и 91, отправленію санитарным поѣздом в первую очередь подлежать малоимущіе. К таковым относятся тѣ бѣженцы, в свидѣтельствах которых соотвѣтствующими національными организаціями, или бѣженскими комитетами сдѣлана надпись о безплатном проѣздѣ или выдано указанными организаціями удостовѣреніе о малосостоятельности.

Имущим бѣженцам предоставляются лишь мѣста, оставшіяся в санитарных поѣздах [illegible] лицами, означен [...]

ПРИКАЗ.
№ 107.

24-го августа, 1918 г.

По взаимному соглашенію с Главным Комитетом, Военно-Санитарным Управленіем назначается комиссія для сдачи и пріема распредѣлителей в составѣ: одного представителя мѣстнаго эвако-пункта, по одному представителю от Московской Коллегіи о плѣнных и бѣженцах, от Центральной Коллегіи о плѣнных и бѣженцах, от Московскаго Окружного Военно-Санитарнаго Управленія и Главнаго Военно-Санитарнаго Управленія.

Комиссія по сформированіи приступит к сдачѣ, и пріему в порядкѣ установленном самой Комиссіей.

ПРИКАЗ.
№ 108.

26-го августа 1918 года.

В измѣненіе приказа № 2 права, предоставленныя Центральной Коллегіи п. 5 декрета от 27 апрѣля, в отношеніи органов военнаго и военно-санитарнаго вѣдомства, не распространяются на уѣздныя, губернскія и областныя коллегіи и остаются исключительно за Центральной Коллегіей.

Предсѣдатель Центральной Коллегіи о плѣнных и бѣженцах

І. Уншлихт.

Масква, 10 сенцябра.

Многія людзі думаюць і верацць, што равалюцыю робяць адны толькі людзі тады і у той час, калі гэтаго ім захочацца. Вось, паіхняму, задумала грамадка якіх-кольвячы людзей пяракруціць усе на свой лад, парадзілася між сваіма сябрамі, выра біла пляну свае работы і давай гізаваць. Удасца—добра, няудасца —іншы прапала. Думаючы гэткім манерам, яны і цяперашнюю, сучасную нам равалюцыю з'ясняюць с помачу гэткаго легкаго парашэньня. Вось за гэтым зусім німа дзіва, што яны гавораць: „Бальшавікі робяць тоя й тоя! Яны захацелі таго і таго і стараюцца вымагчы яго ад жыцьця і г. ін". Тыя, хто гэтак думая, у многум абмыльваюцца: у складваць усяго таго, што мы бачым у тых вялікіх пераломах люцкога жыцьця, якія завуцца равалюцыямі і выклікаюцца да свае выявы асобнымі законамі эканамічнаго развіцця, законам поступу,—на адных людзей, на іх волю і пахаценьня-будзя за многа. Прауда вялікую вагу мая гэта, але бяз таго закону у жыцьці, які с пакон яго кіруя развіцьцем жыцьця, намяркоуваючы яго па пуціня поступу, бач паляпшэньня і розцвіту, людзі быліб бязмоцнымі. Гэты закон мая у сабе крэпкую сілу і уладая над усім жыцьцем на зямлі. Дзякуючы яму, людзі с кожным часам разумнеюць, дастаюць боляй адукацыі, вучацца як спарней ды з большымі скуткамі вясці барацьбу с прыродаю, прыцягаючы захаваныя у ей сілы сабе на услугу. Па гэтаму закону ікрас і ідзе люцкоя жыцьце і весь час усе яно папрауляяцца, абгладжваяцца і становіцца лепшым і прыятняйшым. І вось, весь час перабудоуваючыся, яно калісці і прывядзецца да таго, што на зямлі будзя панаваць рай: ня будзя ні бедных, ні багатых і усяго будзя кожнаму удоваль.

Ведома, супроць гэтаго закону эканамічнаго развіцця і поступу, маяцца шмат варожных сілау, якія супярэчаць яго руху. Гэты сілы заложаны у тых слаех жыцьця, якія стварыліся на яго працягу і увабралі у сябе найболяй яго ды ня хочуць ніякаго пераінача ваньня, прывыкшы да раз аблюбованаго і выгаднаго ля сябе палажэньня. Напрыклад, пануючыя, багатыя людзі і целам і душою прасосаны спрэчнаю поступу сілаю, бо яны міжвольна ачуваюць, што паляпшэння палажэньня адных—робіць горшым іх палажэння. Але на тоя есцяка жыцьце жыцьцем, каб паборваць смерць. На тоя назначан пры нараджэньні гэтаго жыцьця і закон поступу — развіця, каб зніштажаць усе старое, ня патрэбнае, якому даецца свой асобы тэрмін часу, і будаваць новае. І вось, будуючы новае, ломіцца і руйнуецца старое. І руйнуецца яно двыма спосабамі: ціхім і няпрыкметным (па заграніншнаму—эвалюцыяй ен завецца) і другім, стромым, гострым, які завецца равалюцыяй. У тых вабласцех жыцьця, аджываючых свой тэрмін, дзе сіла варожая слабей—там абыходзіцца цішком—там жа, дзе руйнуваць прыходзіцца больш—ня міная бяз равалюцыі. Равалюцыя ж прыходзіць ікрас у той момант, калі аджываючыя хвормы і склад, і будова жыцьця прымушаны законам яго паступоваго развіцьця прыняць новыя і хвормы, і склад, і будову. Гэты закон ікрас і гізуя цяперака жыцьцем Расейскае Распублікі, ломячы і крышачы старыя будоулі і узводзючы новыя, пякнейшыя і прыемняйшыя. Тыя людзі, ля якіх гэта змена дае выгаду, прыносіць карысць, бо паляпшая іх палажэньня, спагадаюць гэтаму і прыкладаюць свае сілы дзеля таго, каб хуччэй вялася гэтая пярабудоуля. Яны завуцца равалюцанэрамі—у наш час бальшавікамі. Другім жа гібельна гэта пераломка жыцявая, якая адбірая ад іх іх багацьця, іх дабро, і яны стараюцца сабраць усе сілы, каб імі папярэчыць ей і сыпыніць далейшая развіцьце равалюцыі, далейшая будаваньня новаго справядлівяйшаго жыцьця. Чым упарцяй і стромяй гізуя сіла поступу і напірая на ход па пуціня паглыбленьня і пашырэньня равалюцыі, тым воражныя сілы настойняй змагаюцца з гэстым. У нашуй расейскуй равалюцыі прыхільнікамі яе, як то усягды і усюды есцяка працоуныя людзі, селяня і работнікі, а варагамі грашаунікі, памешчыкі, усялякія гандлеунікі паны і уся буржуазея. Вось між імі і вядзецца сучасна смяртовая барацьба. На баку працоунаго народу закон поступу, за буржуазеяю ж-толькі тоя пазнаньня багацьця і сіла золата, якія праз доугі час яна высеала з працоунаго народу. Гэтым варужжам яна і гізуя на усе лады абманвая цемных, падкупляя усякіх прадаунікау і цкуе супроць іх братоу і іх інтарэсау. Усялякія белагвардзейцы, чэха-славакі, казакі—багатыя—гэта і есцяка іх купляныя часткаю, а часткаю абмануты слугкі і варагі равалюцыі, якія вось скора два гады, як змагаюцца з равалюцыяй і нічога зрабіць нямогуць у адчынянуй бойца.

Ня поспях іх—іх бязсіля і слабасць. Вось азнаючы гэта свае бязсільля і гэту слабасць сваю барацьбе з равалюцыяй а праз яе і з законам жыцця, яны няпамерна злуюцца, сіберпічаюць і збіраюць усе скарбы і багацьця, і розуму, каб выкарыстаць іх ля свайго спасеньня ад нямінучай смерці. І калі адчыняная барацьба іх нязадавольвая, даючы малыя скуткі, тагды яны перайходзяць да скрытнае, зладзейскае барацьбы, к нападам на кіраунікоу працоунага народу, на папярэдніх равалюцанэрау з-за вуглу. Гэты спосаб завецца застрашшам (тэрарам). У апошні час яны ужылі яго, застрэліушы двух ведомых равалюцанэрау на смерць, аднаго раніушы, і многа другарадных забіушы. Ці паможа гэта спыніць паступовы ход жыцьця праз равалюцыю, ці не? Гопыт с устрашшам на працягу гісторы паказау, што яно слабо дзеля вайны з законамі магутнай сілы. І яму ня спыніць развіцця Расейскае Равалюцыі.

К 3-му З'езду Радау Заходняе вобласці.

10 сентября н. с. у Смаленску адчыніуся 3 з'езд Радау Заходняе вобласці. Нам покуль што невядомы тыя пытаньня, якія будуць абрахоувацца на з'ездзі, а дзеля гэтаго нам нельга судзіць аб працы яго і нямагчыма сказаць аб тых задачах, якія іон сабе пастанавіу. Калі мы бяромся тут гаварыць аб з'ездзі, та толькі хочам выказаць свой погляд на глаунейшае пытаньне, якое па нашай думцы з'езду належала б разглядзець і добра разглядзець. Гэтае пытаньня—аб пашырэньні дзеі і правамоцнасці Вобластнаго Выпауняючаго Камітэту, калі такі застанецца і аб залажэньні такога палітычнаго цэнтру, які б расрасціrау свае валадарства і палітычны распарадак на **усю Беларусь і усіх Беларускіх грамадзян,** дзе б апошнія ні знаходзіліся.

Натрэбнасць у такім пытаньні відаць вось с чаго. Дзякуючы усім прыпадкам апошніх часоу Беларусь, як тэрыторыя разарвана у шматкі: асобныя кавалкі яе та быццам належаць да Германі, та Украіны і Літвы та маюць незалежнасць пад нямецкім валадарствам, і толькі усходняя частка яе застаецца вольнаю. Ва усіх занятых мейсцох складаюцца правіцельствы і установы бяз усякаго веданьня і запытаньня аб гэтым у мейсцо-

Байструк.

— Ведаяш, Гэля,—загаварыла Гапа, стрэушыся са сваею таварышкаю:—а у гэтаго пасэсара якая прыгожая дзяучына! Няужэ то яго дачка? здаецца сам ен з жонкаю і нясамавітыя сусім, а тота ж такую пекную дочку маюць. А можа часамі то і не іх дачка, а госціць у іх? Вось і учора я бачыла яе у сьвятошнюм гарнітуру бегла кудысь і сіоньпі з раньня яна...

— Эй, не! Кінь казаць,—перабіла яе Гэля:—яна штодня у будзіоннум ходзіць. Учора, напрыклад, я сустрэла яе з бацькам едучы у поля з сахою ды бараною, а сеньні яшчэ нядауна мы разам з'ею паілі коняй.

— Ну, і можа што ты гаварыла з ею, пытала чаго?

— Не, пытаць не пытала, а загаворваць прышлося. Вяселая такая, гасцінная! Я запрашала нават яе на суботу гуляць да нас...

— Ну-у?—зацікавілася Гапа:—а што ж яна сказала: прыдзя, ці не?

— Казала што прыдзя... Ведаяш, яшчэ трэба будзя калі папрасіць яе, а то можа з першаго разу ей ня емка іці; незнаемыя усе, чужыя, ніякавата.

— Ведома, ведома!—згадзілася Гапа, трэба запрасіць.—Эх, у нас тады ужо будзя адмысловая зборня-а-а! Сэтых галякоу нігоднае ня пусцім і на парог! Ня вельмі выграюць яны, нябось! Устрашылі! [illegible] Карзунянка усе хлопцы да нас пяройдуць... А мае бацькі дазволяць гуляць у сенях, я ужо іх пытала... Ага, бок, Гэлячка, а як хаця завецца гэта пасасорка, ты ня ведаяш?

— Ю... ю... Юля, здаецца, калі ня ашукваюся! — адказала Гэля.—І імя нават знарок да твару падобрана. Юля! Пекная імя, ціж ня прауда, Гапа?

— Пекная!

— А ці надаугa яны пераехалі да Цімкі? Не пытала?

— Ня меняй году; здалі у арэнду зямлю та ужо ведома, што меняй году ня прабудуць.

— А багатыя, нябось!—відаць па усім, што ня з бедных!—уткнула сваю думку Гапа.

— Не-э, яно та можа і ня зусім багатыя, але шляхетныя людзі, далікатныя: чыста адзяюцца, глядзяць за сабою, — разуверыла Гэля.

— Чаму ня багатыя? Бедны чыста хадзіць ня будзя, ня састарчыць у яго на гэта... Бач, як ты думаяш, каб багатыя та пеяк ляпей было б; вось усе аднакава: я, ты, Карзунянка і яна, Юля... Свой народ. Ці ня прауда?

— Так та так! Ня дружыцца ж з гэстымі галянкамі!.. Эх, мой Божа! Ні роду, ні плоду, а яшчэ і ганарацца, да нас раунуюццу. Вось гэтыя Лаханькі, казала мне мама, дык нядаупачка усе жабракамі былі, па весках лазілі да хлеба па падвоканьню прасілі, і толячкі нядауна акрылі крыху. Нам нават брыдка і спатыкацца з імі, а мы дык шчэ і руялі разам колькі часу... Ха-ха-ха! Цудныя мы! Каб у якіх кольвячы Ганцох [illegible] з другімі па гоны б-ца сустра- Карзунянка усе яшчэ ня можа растацца з імі; хіба яе маці ня прашкаджая іой? Мая дык дауно мяне упікала за гэта і ня раз нават крычала: „адна лепш, кажа, гуляй, а ня пагарджай нашаго котлішча. Ды і твая, нябось, маці цябе ня хваліць за гэта...

— Бо інача і нельга, — згадзілася Гэля... Бач, сама Карзуніха некая няцямлая і Тарэсі сваей дазваляя усе... Ну, але мы яе перацягнам. Няйпачай, перацягнам да сябе... Заутра вось знарок сустрэну і скажу, хай ужо мой гонар пяройдзя...

— Э, не!—сыпыніла Гапа:—сама ты нячапай. Лепш папрасем Піліпа ці Гната, хай яны дагаворацца з ею да гэтаго... О, Піліп умея як падыці! Ен ей гладка усе скажа і, убачым, на суботу усе змайструяцца, як лепш ня трэба... Лахва!—Гапа ажно закацілася сосьмяху, падцісьнуушы слова „лахва" і азірнуушыся вакол, думаючы, што хто зацікаулян і слухая.

— Ша, ты, ня гукай, цудная! — суцешыла Гэля... і так сама азірнулася вакола:—А добра такі будзя-а! Піліп, Гнат, Раман і мы у чацьвярых! Няхай ня кажуць хлопцы, што мы адзінотны, што нудна у нас...

— А ці табе ужо хто казау гэта? — запытала Гапа.

— Да гэты Ігнат! Ці ен на смех, ці саправды, але заусягды мне говора: „хай бы вы злучыліся ды разам гулялі, а то усе адны. — Ну, а мой Піліп яшчэ ні разу ня казау: ен, відаць, яшчэ боляй рад, што мы адны,—ужо на шэпт праказала Гапа... [illegible] хадзі, кажа, лепяй зусім [illegible] звадзіць"... Ведаяш, люблю, аднак я яго вельмі! Што даляй, та больш...

— Чаму ж, пекны ды знатны хлопяц. Завідую табе, галубка...

— Гапа, Гапа!—данесся да гаворачых кліч, і Гапа азірнулася у той бок, аткуль звалі.

Ля двару стаяла яе маці і ківала.

— Маці заве, трэба ісці вячэраць, — сказала Гапа Гэлі.

— Але, ужо пара такі!—адказала тая. —Хадзем, а то скора і мая будзя гукаць... Ну дык у суботу я с пасасоркаю да цябе прыду. Накажы Піліпу, хай прыходзіць, а я скажу Гнату і...

— Няйначай, Гэлячка,—адказала Гапа і, хутка пацалавауншы таварышку у шчоку, подскакам кінулася да хаты.

На вуліцы ужо ікрас было змеркла. Запаноувала сціш. Жыцьціо перакацілася на момант у хаты, дзе людзі вячэралі і збіраліся ко сну. Зрэдку паскрыпвалі вешніцы ці вароты і бразгалі засаукі.

На небя міргацелі яскравыя зоркі.

II.

Гапа весь час толькі і думала, што аб суботнюй гульні. З гэтымі думкамі лажылася спаць, з імі уставала, і яны праводзілі яе на працягу усяго дню за работаю. За работаю! Куды, бач, была ужо тая работа! Думкі проста усе чатэры дні пагальна варочаліся у галаве і перабівалі усякую работу. Ішла Гапа палоць лен ці грасаваць картоплі, ці ехала баранаваць—нічога ня клеілася у яе: возьмяцца за работу, а тут разам і станя: задумаяцца, замарыцца суботаю і час пройдзя ніушманкі.

—Што ты так задумоуваяшся, Гапка?

АД РАДАКЦЫІ.

Рукапісы, якія прысылаюцца ля друку, павінны быць чытальна напісаны на адным боку паперы.

Няпрынятыя рукапісы звяртаюцца аутарам, калі ля перасылкі будзя прыслана марка. Малыя рукапісы ня варочаюцца зусім.

РАДАКТАР ПРЫМАЯ ад 11 да 4 г.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква Паварская, 52, тал. 1-51-63·

ваго працоунага народу. Ад усяго бытцам народу трапунковыя самазванныя правіцяльствы, ня маючы ніякае правамоцнасці, прагуцца будаваць гасударственнасць па свайму разуменьню і жаданьню і прадаюць зразу і па часткам народныя інтарэсы. З другога боку праз вайну шмат беларусау уцякло з роднаго краю і цяпер хоць вайна і скончылася, ня мая магчымасці трапіць да дому і гібея бяз хлеба і свайго кутка. Заступіцца за іх німа каму, памагчы у іх горкай долі — тоя самая. Па розным справам свайго жыцьця бежанцы належаць да розных устаноу і ад гэтаго робіцца некая блытаніна. Каб хоць крыху развязацца з ею, каб хоць як кольвяк нарыхтаваць перавозку бежанцау і іх устрой дома, трэба залажыць тоя ж самая адзін цэнтр, які ведау бы усімі бежанскімі справамі як тут‘ так сама і у забрануй часца Беларусі.

Вось ужо гэтыя два закладныя пытаньня—палітычная кіраваньня усею Белерус‘ю і устрой бежанцау выклікаюць думку аб залажэньні едзінаго цэнтру палітычнаго і адміністратыунаго, які меу бы магчымасць кіраваць усімі Беларускімі справамі. Ні адзін працоуны беларус ня можа згадзіцца з захапляньням Беларусі кім бы та ні было, ні адзін беларус ня згодзіцца с адбудоваю старога парадку, які пасаджваяцца на Беларусі мракабесамі, падняушымі сваю было зніклую голаву. А дзеля гэтаго задачаю краявоя уласці павінна быць барацьба с тымі правіцялямі, якія заселі у Мінску і мусяцца варочаць лiосам усяго беларускаго працоунаго люду. Вось праз гэта адно з задачау краявоя уласці павінна быць збудаваньня цэнтру, які рабіу бы „палітычны працівавес“ Мінскай Радзя і Сакратарыяту і выяуляу бы істны голас беларускаго працоуніка.

Але каб гаварыць ад беларускаго працоунаго народу, каб пасабляць сваім братом-беларусам, гэты цэнтр павінян і сам мець прозвішча беларускаго, інакшай іон ня будзя мець юрыдычнай правамоцнасці перад гэрманскімі уласьцямі. Дзеля гэтаго, калі залажэньня такога цэнтру, ці установы, якая распрасцерла б сваю кампэтэнцыю на увесь беларускі край, будзя прызнана патрэбным з‘ездам, та такой установя належыць даць званьня беларускай, а саму заходнюю вобласць трэба пераінакшыць у Беларускую вобласць

Калі ж з,езд Радау заходняе вобласці ня зробіць залежачае настановы ці адцураяцца сусім разглядзець гэтых два пытаньня, та Выпауняючы Камітэт Заходняе Вобласці і у будучыня так сама мала будзя мець вагі і вартнасці дзеля напырэньня палітычнае дзеі сярод аграмад беларускаго народу, як і да гэтых часау і праз гэта будзя зробляна вялікая шкода равалюцыйнаму руху у забрануй Беларусі і устрою тых бядакоу, якія ужо чацвіорты год марнуюцца па чужых кутках.

М. Н.

Ралкі бяроз.

(Е. Канчару).

Ціха шапталіся ралкі бяроз
Ночкай пагодлівай, яснай
«Збуцься, сяструхна, жудлівых ты слез,
«Збуцься ты долі няшчаснай.
«Ветрыку пахкаму ліст падстауляй
«К месяцу й зоркам хістайся,
«Дзікуй навалі глуміцца ня дай,
«З сілаю, с пэнтам змагайся“..
—Рада, галубка, з жыцьця карыстаць,
Рада красой апівацца,
Толькі, сяструхна, ня трэ забываць
З горам ды мукай страчацца.
Вецяр халодны, бывая парой,
Узгонам сіберным павея
Й нас нячакана разлуча с табой—
Думкі аб шчасці разсея
Знаючы ж гэта і радасць тады
Цьмея свасй чыстатою!
Чорныя кроплі маркотнай жуды
Даць нам ня могуць спакою.
«Знаю і чую усе гэта і я,
«Вось жа за тым і кажу так,
«Хайбы душа маладая твая
«Гарда наборвала смутак.
«Хвіляй бягучай ты цешся адно—
«Думак с‘пяненых нярухай,
«Шчасцям захопным упівайся пауно
«Оклічау буйных паслухай.
«Будзяш-ня-будзяш ты сэрцам нудзіць,
Смерць патом нас ня праміня.
«Хочацца ж неяк вальготна пажыць
«З радай, бязклопатнай мілай
«Слауся ж, прырода, абуджаных сноу,
«Слауся, жыцьце маладоя!“
Й ветрык галінкамі ласкай прайшоу
Ралкі страхнуушы сабою.

Цішка Гартны.

Значнасць нацыянальнаго пытаньня.

Чым даляй, тым боляй і боляй дастаецца значнасць і вага у жыцьці нацыянальнаму пытаньню. Ня гледзячы на шырокі размах інтарнацыянальнаго напрамку расейскай равалюцыі у сэнся космапалітызмы, яно упарцяй і упарцяй прабіваяцца на повярх узбаламучанаго мора расейскаго жыцьця і міжвольна прыцягая да сябе увагу кіруючых палітыкау людзей. Асобна гостра дае аб сабе знаць нацыянальная пытаньня у тых мейстох, дзе да яго падходзяць нягопытныя людзі і пачынаюць „рубіць сплеча“ замест таго, каб аднясціся да гэткаго важнаго з‘явішча сур‘езна, удуманна. І вось, адзін няасцярожны крок і застаецца вялікая і значная абмылка, якая цягня за сабою вялікую бяду. Пошля прыходзіцца каяцца шкадаваць, але паправіць нельга. Тым часам у бегу часу усе пачыная забывацца і, што рабілася нядауна у адным канцы, перарабляяцца у другім, і, у свой чарод, дапауняя цуг важных абмылак.

Нацыянальная палітыка Радавае уласці с першаго пачатку яе жыцьця, прыняла самы праудзівы, самы патрэбны і разумны напрамак, як то і належыць чакаць ад народнай уласці. І весь час гэты напрамак у цэнтру ня меняяцца. Але ня з‘ясненьня яго істнасці на мейстох, у асобных частках фэдэрацкае Расейскае Радавае Распублікі, ганьбуя чыстату у цэнтру і прыносіць вялікі утратак яго вартасці наагул.

Значнасць і вага нацыянальнаго пытаньня патрабуя ля свайго пазнаньня досі вучаных і асьвячоных ды асцярожных людзей; яны патрабуюць ля свайго пазнаньня так сама людзей з тых нацыяу, якія ня мелі можнасці у гісторычным жыцьці блізкаго часу быць пануючымі і выхаваць дасюль у сабе дзяржаунная пачуцьціо. Абмежнасць Расеі, дзе надта вытыркая нацыянальная пытаньня, заусюды лічылася казлытным мейстам і заусягды тут спатыкалася палітыка уласціоу. Вось увесь апошні час многанацыянальны Каказ, як у катле кіпеу равалюцыйнай барьбою і разам с тым—нацыянальнай, якія гэтак тонка сплеталіся і сплятаюцца там, што надта цяжка разглядзяць і адмеціць іх сплiот. Аднак нацыянальныя спрэчкі прапускаліся там скрось пальцы, нядбаліся і у скутку прыходзіцца прызнацца, што дастаецца нам і усей равалюцыі ад гэтаго значны урон. А скеміць бы зразу і прыняцца талкова і пільна разбэрзскваць паміж-нацыянальныя спрэчкі, тадыб яно мела б зусім другі, многа карысняйшы выхад.

Тоя самая мы бачым і на заходняй абмежнасці, дзе мейстовая уласць ніякім родам ня хоча прызнаць высунутых жыцьціом настойных пытаньняу нацыянальных. Сляпоя і упартая запядбаньня іх, само сабою, можа прывясці да дрэнных скуткау, але ужываючыя прыказку „пошля мяне—хоць патоп“—з гэстым ня лічацца.

Трэба сказаць, што на гэткі блізарукі пагляд някаторых элементау работнічаго правіцяльства на мейстох, мая уплыу двух радоу агульныя прычыны. Пертая— гэта ня дасканалая асвядомасць гасударская і павярховая паразумення задачау равалюцыі, як інтэрнацыянальнай. Апошняя прозвішча, дзякуючы малой культурнасці работнічаго стану у Расеі, цесна лыгаяцца у яго мозгу з разуменьням значнасці, якая выходзіць з „космапалітызму“—што ужо дауно адкінута вядомымі вучонымі і знатакамі сацыяльных навук. Сэнс інтарнацыяналізму — гэта вольная злука вольных народау, а зусім ня знішчажэньня усіх нацыяу... Другая прычына, так сама ня малая, ляжыць у тым, што нягледзячы на ужываньня слоу і гопытау у сэнся космапалітызмы, нацыянальная чуцьціо, вывярнутая і пансаваная, дае усеткі аб сабе знаць і нават спора. У прадстаунікау велікарасейскай нацыі, яно пад тулям дзяржаунасці выбіваяцца наверх і прымушая выраблянць пагляды, у якіх адбіваяцца няувага да пакрыуджанаго нацыянальнаго чуцьця народу, выхаванаго у пагардзя,— нацыянальная чуцьціо вырабляя асобную сілу, якая на глебя ухвалы аднэй нацi перад другою, родзіць варажасць і адваротнасць. Гэтак, жыдоускі работнік, ні-

---

—запытала дачку адзін раз маці, пайшоушая разам з ею палоць лен.

Гапа раптам схамянулася, нібы ня разабраушыся, ці робіць яна, ці стаіць; толькі хвіль колькі спусціушы адказала:

— Вось думаю, мамачка, усе аб... і ня даказала, а прынялася шчыра за працу.

Маці ня настойвала дапытвацца і так абышлося. А другі раз яна рашыла між вушэй прапускаць усе, каб ня уразіць свае каханае дачушкі.

І гэтак дайшло да суботы. Праўда, чатэры дні прайходзілі як чатэры месяцы, гэтак доуга і нудліва. Нудліва і доуга яны здаваліся боляй, яшчэ і таму што Гапе няудавалася, бы на бяду, ні разу спаткацца са сваім Пілінам і аперэдзіць яму вяселая суботняя гульбішча. Колькі яна разоу знарок ня праяхджала між вучылішча і воласці і як пільна праяхджаючы ня узіралася у вокны і на двор, нідзе яго, як другія разы тоя бывала, ня убачвала. Да дому ж да яе ен так сама ня прыходзіу вось ужо больш за тыдзянь. У галаве Гапы прабягалі дагадкі—думкі, што „яго, бадай, німа дома! Ці ня паехау адно па якім кальвячы справам воласці у павет?“ Іншыя думкі ня зароджваліся і па іх яна спынялася. Спынялася і была спакойна, нікому, навэт Гэлі, шчэ некулькі разоу страчаючыся, ня намякала аб іх. „За тоя у суботу, як толькі сустрэнуся з Піліпкам, — малявала Гапа што вечар, ляжучы у сенях на ложку:— дык так горача абдыму яго, так шчыра пацалую!.. Эх, скарэй бы тая субота прышла!“. І прага, як пліон муляу абразоу забірала усю яе маладую свежую постаць, абурвала яе і прыносіла некую асобную цягучую ліпкую утому, з пераможкую та холаду, та гарачыні. Доуга ня магла яна засынаць, варочалася з боку на бок; а, заснуушы, усю ноч бачыла дзіуныя, та цудоуна-прыемныя, та страшна—злыя сны...

Пад канец прышла і субота. Гапа— прапнулася ікрас у яе пазней за усе разы, бо з вечара была запеуняна няйменьням ля сябе ніякае работы. Пры тым хмурная, з дробна пакапліваючым дождзыкам пагода, забяспечвала гульню і усім у хаця. Уставаць ей было надта цяжка, бо, дзякуючы маркотнуй пагодзя, на сэрцы у яе было млосна, і думкі афарбаваліся у сумную мулю.

— Мабыць дождж сеньня пройдзя весь дзень!—праказала устаушы Гапа ні то сабе, ні то бацьком.

— Ня можа быць!—адказау уверана бацька, кінуушы вокам праз вакно на неба.—Здаецца вонь ужо пачыная распагоджвацца... А добра б было,—абярнууся іон да жонкі і Гапы разам,—я яшчэ паехау бы сеньня у лес да возік ламачча прывез бы.

— Да ужо сеньня няхай, пасьвяткуй лепш,—сыпыніла жонка гаспадара.

— Да яно, відаць так і будзя, мабыць. Хай ужо панядзелкам, пошля ворыва,—адказау той.

Гэта гутарка між бацькоу і ачуваньня свьята, неяк крыху падвясялілі Гапу. Да гэтаго яшчэ прыбавілася і пачынаючая распагодзя: з усходняго боку пакалолася хмара і выглядзяла пагодная чырвань—знак таго, што дождж канчау іці.

— Хацяп распагодзілася! — з жарам пахаценьня праказала Гапа і некулькі часу узіралася у чырвань.

— А табе хочацца пагуляць на пагодзя сягоньня?—смяшліва ні то упікнула, ні то запытала маці.

Гапа ухмыльнулася:

— А, ведома, пры пагодзя лепш, як пры дажджы...

І троха памаучаушы дабавіла:

— А ведаяця, мама, што?

— Ну, што?

— Мы сягоньня будам гуляць у нас; вось калі будзя дождж, та прыдзяцца гуляць у сенцах, каліж пагода-та на дварэ. Добра, а?

— А чаму так у нас? — запытау бацька-

— Таму, татка, што мы з Гэляю ды Карзунянкаю парашылі адкасніцца ад гэтых галячак Кузабавых да Качэргіных. Будам лепш сваю зборню мець...

Бацька змаучау, толькі паківаў нядбайна галавою. А маці сказала:

— Гуляйця, толькі вельмі ня крычэця па падвоканью... А хто ж з вамі будзя больш? Ці вы толькі у траіх?

— Ого, мамка, яшчэ да нас прыстала... дачка пасэсарау, Юля.. Ці ведаяця яе?—рада праказала Гапа.

— Ведаю, ведаю, пекная дзяучына... як ягадка, і дасціпная такая... бачыла я яе...

— Вось Гэля яе прасіла прыці да нас і яна згадзілася.,.

Пошля гутаркі Гапа паснедала, потым узялася канчаць вязаць прошву, якую яна зачала ужо ад самае масляніцы і гатовіла на абрус, і покуль гэта зрабіла, у хаця пачау адмячацца па кутках змрок падыходзючаго вечара. У няпрыметку іой на дварэ разыгралася дзіуная пагода, і на вуліцы у многіх мейстох ікрас падсохла; нават у нізінах пакарчанела гразь. Заходзючая сонца чырваньню прамень мулявала шчыты хат і адбівалася у шыбах вокан. У Гапы на сэрцы так сама іграла радасць ачуваньня блізкае гульні. Скоры прыход яе да таго забрау яе, што яна ня думала ні аб чым: ні аб рабоця па убору, як то рабілася што тыдня, хаты, ні аб вячэры нават. Кінуушы вязаць прошву, Гапа зразу стала убірацца гуляць: памылася барскім мылам, зачасала косы у куклу, наставіла спераду чуб і перамяніла будзенная-мультановая плаця на сатынковая рудоя. А, справіушыся з нарадам, яна стала у вакне і нязмігутна сачыла за праявaю вячароваго жыцьця на вуліцы, дзе селяня спяшылі с поля, а так сама ішлі каровы і беглі гавечкі.

— Можа павячэраям, да я пайду заганяць каровы? — запытау Гапін бацька у мацяры.

— Павячэрайма такі, — згадзілася маці: — вось і Гапа з намі перакусіць, а то, відаць, дрэнчыць на вуліцу.

— Не, я ня хачу, — перапяла Гапа, нявылазячы з вакну.

— Чаму не, як то не! Вось ураз жа я падам.

Але Гапа паставіла на сваіом, і толькі маці вышла чагосці за парох, як яна драпанула на вуліцу.

Цішка Гарны.

(Будзя даляй).

колі нідзе ня чысты ад нацыянальнага пачуцьця—і гаварыць ня дае, калі рэч паднімаецца аб тым жа у яго таварыша з другога народу, польскі—тоя самая.

Калі дадаць да гэтых двух прычын важнейшых імючыя частказ і іншыя, та вельмі ясна стане, што покуль яны будуць ужывацца—а будуць яны ужывацца да наднядзя культурнаго развіцьця спрод працоунаго народу—датуль развіцьцію равалюцыі будзя мець нядалік ад абманнаго і няпраудзіваго погляду на нацыянальная пытаньня. Прауда, абмінуць гэту далячыню частказ было б можна, каб цантровая правіцельства узяло цьвіорды тон у правідзеньню свайго напрамку і на местах. Назначэньня сьвядомых і падгатаваных працаунікоу, кіраваньня з цэнтру праз асобныя чыста нацыянальныя установы, якім пад наглядам Камісар'яту па справам нацыянальным, было б дадзена права шырокай ініцыатывы—вось найлепшы скутак. Ці пойдзя, ці не цантровая ведамства гэтаю сцежкаю, залежыць ад поунаго з'ясненьня ім патрэбнасці наагул у разумнум парашэнні гэтаго значнаго і важнаго пытаньня, як нацыянальная. Але дзесяцімесяцовая прахтыка яго, бадай, прымусіла шмат карысных пліонау у гэтуй вобласці у, апіраючыся на іх, можна распасьцірацьь працу у шырокі.

Астауленьня ж і недбайнасць да няянавага, выраблянага на усем обшары, шырокаго і свабоднаго кірунку датычна справу нацыянальных, прывідзе за сабою бядовыя скуткі, ад якіх нацярпіць досі шмат далейшая развіцьцйо Расейскай Равалюцыі і падсячэцца увага да Радавай уласьці. А ня толькі што пустою забавай стане дасюлашняя праца Кам. па справам Нацыянальным.

Зміжыла.

Аб усім па троху.

З Беларусі.

У Магілёві адбыуся анархіяльны з'езд на які, ня глядзючы на забарону радавае уласці, з'ехалася шмат паноу з забраных мейстоу. З'езд адправіу паняхіду па цару. На гэтуй паняхідзя былі усе сябры з'езду і местовая духавенства.

З Магілёва пішуць, што у горадзя с кожным часам памяньшаяцца лік жыхароу. Жыхары уцякаюць праз тоя, што расце безрабоцьця і дарагоуля, а так сама дужа цяжкі парадак устроілі немцамі і чорнасотніцкімі чыноунікамі.

Грабства і абіраньня немцамі захопляпай часткі Беларусі ідзе поуным ходам. Немцы біруць усе, жыта, масла, яйкі, жывелу, пават апранаху. Гэта выводзіць с цярпеньня людзей, якія усе часцей збіраюцца грумадамі з варужжом і супрацівяцца німецкаму гвалтоу'ю. Усюды ідуць бойкі. Немцы змагаюцца з гэтым старэнна і дзіка распраулюцца з вінаватымі: вескі паляць кашчэнт, а людзей вешаюць. Каб ня даць магі вырасці адпачасове у многіх мейстох паустаньню, яны убольшылі паліцыю, закрылі усе работнічые хаурусы, забаранілі зборышча. Палітычныя партыі павінны схавацца у таемныя мейсты і адтуль кіраваць работаю.

У Мінску гэрманскі главнакамандуючы адмяніу свой прыказ, якім валеу у Беларусі атабраць усе здавольства і корму жывёлам. Замест гэтаго ён увёу абламаньня дастаукамі у інтадантства.

З Магілеушчыны паведамляюць, што у новум губэрскум выпаунюючым камітэцьця савета усе бальшавікі. Закладаюца савецкія крамы. Касуюца прыватная таргоуля: прылады і тавары адбіраюцца. Таргоуля збіраяцца пад савецкімі наглядам.

Па усім валасцям Вітабшчыны саветы і бальшавіцкія гурткі з звязку з нападам на сябраў работніча-селянскаго правіцельства, прыймаюць пастановы, у якіх гаворыцца, каб зніштожыць тых, хто паднімая сваю руку на іх. Пастановы кажуць, што селяне яшчэ крэпка трымаюць у сваіх мазулістых руках сакеру, якою сякуць усе прашкоды на пуціня да новаго жыцьця.

8 сенцябра у Вітабску адчыніуся трэйці Вітабскі губэрскі з'езд радау. З'ехалася 110 далігатау, прыстауляючых 200.000 выбарчых; с гэтых далігатау належаць: да камуністау-бальшавікоу 85 чал., ім спагадных—15, лівых с. р.—7, спагадаючых ім—3.

Смаленскуй газэця „Извѣстія" паведамляюць з Ворішы, што на станцыі Ворша—таварная адбылося вялікая зборышча німецкіх салдатау, сабрапая, відаць, салдатамі с.-д. з далучэньням пленных. Зборышча пастанавіла зразу ж згаварыцца з расейскімі таварышамі і прасіць кніжак і газэт. Ахвіцэры глядзяць скрозь пальцы, бо баяцца салдат, якія да іх настроены варожа.

У Мінску адчынілася пошта, якая была закрыта с феураля месяцу. Можна перапісвацца з усімя мейстамі Велікарасеі, а так сама з некаторымі беларускімі гарадамі—Магілевам, Бабруском і інш. На днях дазволіць зносіцца з Віленскаю, Гродпянскаю, Сувалкскаю, Ковенскаю, Ліфляпскаю, Курляпскаю і Эсляпскаю губэрнямі. Плата за пісьмы і рожныя пасылкі назначана вялікая. Прымаюцца толькі простыя пісьмы і адкрыткі.

У Вітабску 29 августу гг. адбылося злучаная заседаньня прадстаунікау Беларускаго і жыдоускаго Камісар'ятау, а так сама Латышскаго, Жыдоускаго і Беларускаго бежанскаго камітэт, на яком вынясяна вось якая пастанова: папоуніць калег'ю аб бежанцах прадстаунікамі Латышскай, Жыдоускай і Беларускай нацыянальнасці, дзеля таго, што там іх німа. Прынята пахапеньня, каб перадаць усе бежанскія арганізацыі у спадобныя да іх атдзелы Саветаў усеноу у як можна бліжэйшы час.

6, 7 і 8 сенцябра у Вітабску адбыліся тры двухгадзінныя лекцыі прах. В. І. Пічэты на тэму: «Гісторыя Беларусі».

11 г.м. у Смаленску адчыняяцца з'езд Саветау Беларусі. На павесцы пастауляна шмат важных, датыкаючых края, пытаньпу.

У Смаленску адкрыт вялікі загавор супроць радавае уласці. Кіраунікомъ быу гэнерал Дорман. Заарыштована шмат вядомых кадэтау і правых с. р.

Згодна дапаунаючаго згавору аб заміраньню, немцы з 10 сентября мусяць ачысціць ад сябе частку Беларусі з гарадамі Магілевам, Воршаю і Барысавам.

Ад таго, што нямецкая начальства дужа слаба прымая бежанцау, на станцыях Аляксандраускае дарогі сабрауся вось які лік вагонау с бежанцамі: у Воршы 338, у Смаленску 445, у Вязьмя 91 і у Маскве 91. Покуль ня пірапраявяць усіх гэтых бежанцау, Аляксандрауская дарога ня дае ні паздзоу, ні асобных вагонау дзеля далейшае адпраукі бежанцау.

У Маскву вярнуўся са свае вандроукі у Мінск і Кіяу назначаны Белар. Радаю „консул" Беларускі—А. Бурбіс.

З-заграніцы.

У Японі падняліся вялікія бунты рабочых і бедных людзей з-за няймесьня яды. Бунты пашырыліся да таго, што дагэтуль Японія ня бачыла такіх. Правіцельства пірапалохалася і старалася здаволіць галодных. Разам з гэтым строга карая бунтаушчыкоу, разганяючы іх паліцыю шашкамі і сотнямі заарыштоуваючы.

Ходзяць поуныя чуткі, што цяперашні устрой Аустрыі, якая складаецца з двух хаурусных гасударствау—Аустрыі і Венгрыі—хочуць пераманіць і зрабіць фэдэрацкім гасударствам, з многіх вольназлучаных частак. Аустрыяцкі старшыня міністрау Гуссарэк распрацавау пляну гэтае пірабудовы. Праект (ці пляна) гэты карыстаіцца спагадаю караля і дастау прыватная адабрэньня сяброу парляменту і правадыроу някаторых нацыянальных партыяу у Аустра-Вэнгрыі. Новая фэдэрацыя муся злажыцца с гэрмавцау, чэхау, палякоу. паудзенных слауянау і вобласцеу кароны Святога Сцяпана. Да разрабляньня канцітуцыі (фундаментных законау) фэдэрацыі (заукі) запрошваюцца сябры парляманту, прадстаунікі навукі, прамысловасці і земляробства.

З Расеі.

У Уладывастоку японскія чыноунікі вядуць пяр'пліс жыхароу, каб можна было наглядаць за іхняю палітычнаю ахварбоукаю.

Выявілася, што у Кубанскуй вобласці, апроч цяперашняго ураджаю, маецца паутараста міл'енау пудоу леташняго хлеба.

Чорнасотніцкая „правіцельства" Данской Вобласці адмяніла вольную таргоулю і зачыніла гравіцу, каб ня вывозіць хлеба.

У Саратаускуй губ. у зерняхавальніцы губерскаго здавольсцвяннаго камітету ссыпка хлеба расце. За першы дзень сянцябра ссыпана 11159 пуд. жыта і 10756 пуд. пшаніцы; за другоя 17108 пуд. жыта і 3945 пуд. пшаніцы; за трэйцяя—46396 пуд. жыта і 6753 пуд. пшаніцы.

У гор. Самары, забрануй чэха-славакамі усе вастрогі напоунены селянскаю беднатою, жонкамі і раднякамі тых людзей, якія мелі тыя ці сія адносіны да радавае уласці. У каморках, разлічаных на 5 чал., сядзіць па 40 чал. Пасаджаным выдаецца у дзень па пауфунту хлеба і сырая вада. Шырыцца халера. Хто патрабуя гарачае вады, таго саджаюць у каменны мяшок.

У Арле лівыя с-р. падгатоулівалі выступ супроць саветау з варужжом. Заучэсня удалося гэта адкрыць і пяранянць.

У Пецярбурх разрашана кожпаму чалавеку прывязіць с сабою паутара пуда здавольства. Усім уласцем атдана распараджэньня ня адбіраць правозянаго.

З Гэрманіі у Расеі пачышая патрошку уводзіцца таваразмен. Нядауна у Пецярбурх прышоу параход с гэрманскім вуглям. У блізкі час боляй чакаіцца вугалю. Немцам у абмен даюць лес і шкуры. Мяшая бойкасці таваразмену тоя, што немцы хочуць стрымаць ад Расеі найпачай мець і гумалястрык.

У Пецярбурзі радавая уласць обвясціла у газэці „Сѣв. Ком". 1-шы спісак заложнікау, якія будуць разстрэляны у тым прыпадку, калі будзя забіты хто-кольвяк ад савецкіх работнікау. Спісак пачынаяцца бышымі вялікімі князямі: Змітрам Костусявічам, Мікалаям Міхайлавічам, Юр'ям Міхайлавічам, Паулам Аляксандравічам, Гаурылам Костусявічам- Далей ідуць 2 бышых пры Керэнскум міністры—Вярхоускі і Пальчынскі, некулькі значных банкіроу: Манус, Ждапау, кн. Шахоускі і інш; пуг бышых ахвіцэрау і гэнералау. У ліку правых с-д. бышы пачальнік міліцы Самуіл Шрэйдэр.

Пяцярбурскі хаурус вучыцялеу узяуся за выдавецкую працу. К пачатку вучэньня будзя выпушчана многа падручнікау па новаму спосабу пісаньня.

Смаленск.

На вакзаля нескулька тысяч бежанцау чакаюць атпраукі· Атпрауляць, кажуць, будуць эшалонамі, але перад гэтым трэба счэпліваць тыф, халеру і воспу. Пауталодны народ кожны дзень пягняцца у чарод, каб дабіцца прівіукі. Кожны, відзючы маркасць гетай работы, шчыра просіць у Бога халеры для таго, хто заставляяць шчэпліваць яе. Немцы каланісты і багачы скора едуць: першых свой брат пускаіць, а другіх—грошы. Цікава адмеціць тоя, што іосць многа бежанскіх арганізацыяу, а ні адна нічога карыснаго для іх не робіць. Бежанцы павінны самі рабіць апросныя лісты, павінны самі арганізаваць эшалоны і г. д. Іосць каллегія [illegible] і бежанцах, справа для Бюро гэтай каллегіі, [illegible] камісія і ні адзін чалавек згуль ня прыйдзя, каб перапісаць бежанцау, арганізаваць прівіуку, калі яна ужо так трэба і нарэшця арганізаваць іх атпрауку. Дакуль і гэта так будзя?

Р. Гр—вич.

Радактуя і выдае Друкарскі Атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Типографія Сов. Раб. Деп. Москва, Тверская, Мамоновскій пер., д. 12.